УДК 327:930(4)

**Л. Ч. Дрожжа**
Дзяржаўная ўстанова «Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі»
Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь

# АКТУАЛЬНЫЯ НАПРАМКІ РАЗВІЦЦЯ ЗАХОДНЕБЕЛАРУСКАЙ ПРАБЛЕМАТЫКІ Ў СУЧАСНАЙ ПОЛЬСКАЙ ГІСТАРЫЯГРАФІІ

Прадметам даследавання з'яўляюцца актуальныя напрамкі развіцця заходнебеларускай праблематыкі польскімі гісторыкамі на сучасным этапе. Па выніках гэтых даследаванняў аўтар вызначае трэці, сучасны перыяд, які ахоплівае канец 1980-х – 2000-я гг., і складаецца з двух этапаў. Першы этап ахоплівае канец 1980-х – канец 1990-х гг., характарызуецца спробай аб'ектыўна ацаніць польскімі даследчыкамі існаванне беларусаў як нацыі ў Польшчы ў міжваенныя гады. Другі этап трэцяга перыяду ў польскай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі можна лічыць з пачатку 2000-х г., і ён доўжыцца па сённяшнія дні. Трэці перыяд характарызуецца кардынальнымі зменамі ў сучасных гістарычных даследаваннях, дзякуючы выкарыстанню IT-тэхналогій, і зменамі інструментаў і методыкі гістарычных даследаванняў.

**Ключавыя словы**: гістарыяграфія, польская гістарыграфія, перыядызацыя, сучасны этап перыядызацыі, заходнебеларуская праблематыка.

**Для цытавання**: Дрожжа Л. Ч. Актуальныя напрамкі развіцця заходнебеларускай праблематыкі ў сучаснай польскай гістарыяграфіі // Труды БГТУ. Сер. 6, История, философия. 2023. № 1 (269). С. 126–131. DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-23.

**L. Ch. Drozhzha**
Belarusian Research Center for Electronic Documentation of the Department for
Archives and Records Management of the Ministry of Justice of the Republic of Belarus

# CURRENT DIRECTIONS OF THE DEVELOPMENT OF WESTERN BELARUSIAN ISSUES IN MODERN POLISH HISTORIOGRAPHY

The subject of the study is the current directions of the development of Western Belarusian issues by Polish historians at the current stage. Based on the results of these studies, the author defines the third modern period, which covers the end of the 1980s – 2000s, and consists of two stages. The first stage covers the end of the 1980s – the end of the 1990s, characterized by an attempt by Polish researchers to objectively assess the existence of Belarusians as a nation in Poland in the interwar years. The second stage of the third period in the Polish historiography of West Belarusian issues can be considered from the beginning of the 2000s, and it lasts until today. The third period is characterized by radical changes in modern historical research, thanks to the use of IT technologies and changes in tools and methods of historical research.

**Keywords**: historiography, Polish historiography, periodization, modern stage of periodization, Western Belarusian problems.

**For citation:** Drozhzha L. Ch. Current directions of the development of Western Belarusian issues in modern Polish historiography. *Proceedings of BSTU, issue 6, History, Philosophy*, 2023, no. 1 (269), pp. 126–131 (In Belarusian). DOI: 10.52065/2520-6885-2023-269-1-23.

**Уводзіны.** На сучасным этапе дастаткова актуальным сярод навуковага грамадства Польшчы з'яўляецца вывучэнне развіцця заходнебеларускай праблематыкі польскімі гісторыкамі. Па выніках вывучэння гэтых даследаванняў аўтар вызначае трэці, сучасны перыяд, які пачынаеццца з канца 1980-х г. і доўжыцца на працягу 2000-х г. На думку аўтара, трэці перыяд складаецца з двух этапаў.

**Асноўная частка.** Першы этап трэцяга перыяду, які ахоплівае канец 1980-х – канец 1990-х гг., характарызуецца спробай аб'ектыўнай ацэнкі польскімі даследчыкамі («аб'ектывістамі» і «рэвізіяністамі») нацыянальнага стану беларусаў у Польшчы ў міжваенныя гады. Зрабіць гэта імкнуліся Я. Мірановіч у манаграфіі [1], К. Гамулка ў публікацыі [2], Е. Тамашэўскі ў артыкуле [3], В. Рачкоўскі [4], Р. Вапіньскі [5, 6], Я. Е. Мілеўскі [7], П. Эберхард [8] і інш.

У гэты час з'явіліся працы, якія больш выразна падкрэслівалі дасягненні польскай міжваеннай эканомікі, але нават прадстаўнікам «традыцыйнай» школы гісторыкаў-«аб'ектывістаў» не ўдалося паказаць польскую міжваенную гаспадарку як досыць паспяховую. У дадзенай сітуацыі запатрабаванымі застаюцца манаграфіі Я. Жарноўскага [9], А. Хайноўскага і З. Ландау [10, 11].

Неабходна адзначыць, што трэці перыяд характарызуецца кардынальнымі зменамі ў сучасных гістарычных даследаваннях, дзякуючы выкарыстанню ІТ-тэхналогій, і зменамі інструментаў і методыкі ў гістарычных даследаваннях на мяжы стагоддзяў. Другі этап трэцяга перыяду ў польскай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі можна лічыць з пачатку 2000-х г., і ён доўжыцца па сённяшнія дні.

У 2000-я гг. акрамя аглядных даследаванняў пачынаюць з'яўляцца працы па гістарыяграфіі асобных пытанняў заходнебеларускай рэчаіснасці. Нягледзячы на добрую распрацаванасць напрыканцы другога перыяду ў 1980-я гг., польскія гісторыкі вывучаюць праблемы, якія характарызуюць сацыяльна-эканамічнае развіццё Заходняй Беларусі ў 1921–1939 гг. на прыкладзе асобных ваяводстваў, гарадоў і мястэчак. Цікавыя даследаванні асобных раёнаў і мястэчак Беластоцкага ваяводства праведзены Я. Е. Мілеўскім [7], З. Тамчонкам [12], Б. Чарнецкім [13].

Становішча сельскай гаспадаркі ў міжваенны перыяд адлюстравана ў працы В. Вяржбінца [14]. Ваеннае асадніцтва і яго роля ў развіцці аграрнага сектара эканомікі падрабязна прааналізавана ў манаграфіі І. Стобняк-Смагаржэўскай [15]. Эканамічная дзейнасць польскіх таварыстваў і саюзаў адлюстравана ў манаграфіі М. Качпаржэка [16].

На мяжы стагоддзяў пашыраецца зацікаўленасць польскіх і літоўскіх калег у вывучэнні навуковых прац беларускіх гісторыкаў. Так, у Беластоку ў 2003 г. выходзіць зборнік навуковых артыкулаў «Гісторыкі польскія, літоўскія і беларускія аб праблемах XX стагоддзя: Гістарыяграфія польская, літоўская і беларуская пасля 1989 г.». У ім змешчаны артыкул беластоцкага гісторыка А. Смалярчыка па пытаннях польска-беларускай гістарыяграфіі стану міжваеннай адукацыйнай палітыкі на «крэсах усходніх» [17].

У пачатку 2000-х г. тэма беларускага пытання ў планах кіраўніцтва Польшчы ў міжваенныя гады застаецца актуальнай у польскай гістарыяграфіі. Прыцягвае ўвагу абагульняючае даследаванне Я. Міршановіча «Беларусы ў Польшчы (1918 – 1949)» [1]. Яго калега Я. Чыквін у сваёй манаграфіі лічыць беларускае насельніцтва ў складзе нацыянальных меншасцей ІІ Рэчы Паспалітай як найбольш прыгнечанае і пазбаўленае правоў на самавызначэнне [18].

Неабходна адзначыць, што на сучасным этапе польская навуковая грамадскасць імкнецца разглядаць праблему становішча беларусаў у складзе ўсходніх ваяводстваў міжваеннай Польшчы больш станоўча. Адносіны палякаў і беларусаў у міжваенныя гады гісторыкі Жаляндоўскі Ц. [19] і Сляшыньскі В. [20, 21] разглядаюць як адну з актуальных праблем, якая сёння ўплывае на адносіны беларусаў і палякаў. Ц. Жаляндоўскі адзначае, што праблемы ў беларуска-польскіх адносінах у ІІ Рэчы Паспалітай у міжваенны перыяд былі абумоўлены памылковай палітыкай польскіх улад, накіраванай выключна на асіміляцыю шматмільённай масы беларусаў. Такім чынам, гісторык падкрэслівае, што ў міжваенныя гады адбылося паглыбленне канфлікту паміж палякамі і беларусамі, які негатыўна паўплываў на эскалацыю варожасці ў гады Другой сусветнай вайны [19, s. 115–119].

Неабходна адзначыць, што істотным крытэрыем для характарыстыкі разглядаемай намі польскай гістарыяграфіі з'яўляецца аўтарская пазіцыя, якая падзяляе польскіх гісторыкаў на два лагеры. Адны, напрыклад, К. Гамулка, Я. Міранові, Я. Чыквін, В. Сляшыньскі і іншыя разглядаюць беларусаў, у першую чаргу, як грамадзян ІІ Рэчы Паспалітай, як нацыянальную меншасць, прадстаўнікі якой так ці інакш апынуліся ў гэтай краіне. І дзяржава ў адносінах да іх павінна была праводзіць збалансаваную і найбольш станоўчую для яе нацыянальную палітыку – дастаткова лаяльную, каб не перашкаджаць развіццю і пазбегнуць незадавальнення, і дастаткова паслядоўную, каб абмежаваць сепаратызм.

Другія даследчыкі, напрыклад, Мілеўскі Я. Е., Хайноўскі А., Жаляндоўскі Ц. і іншыя, становяцца на пазіцыі беларусаў як загадзя прыгнечанага народа ва ўмовах рэалізацыі дзяржаўнай нацыянальнай палітыкі «паланізацыі» і «акаталічвання» нацыянальных меншасцей Польшчы.

У залежнасці ад занятай пазіцыі польскія гісторыкі па-рознаму ацэньваюць выніковасць і добразычлівасць палітыкі ўрада ў адносінах да нацыянальных меншасцей. Большасць даследчыкаў мяркуе, што урад міжваеннай Польшчы не хацеў і не імкнуўся задаволіць нацыянальныя і сацыяльна-культурныя памкненні беларусаў. Напрыклад, К. Гамулка адзначае шматгадовую асіміляцыю беларусаў польскай дзяржавай, якая дасягнула ў гэтых працэсах прыкметных вынікаў [2, с. 119]. Гісторык Хайноўскі А. характарызуе нацыянальную палітыку кіруючых колаў Польшчы ў цэлым як няўдалую [10].

Канфесійная сітуацыя ў Заходняй Беларусі знайшла сваё адлюстраванне ў шматлікіх працах польскіх аўтараў у першым этапе трэцяга перыяду вывучэння заходнебеларускай праблематыкі ў канцы 1980-х – 1990-я гг. Па-першае, гэта абагульняючыя працы па гісторыі касцёла і праваслаўнай царквы ў Польшчы, у якіх міжваенны перыяд вылучаны ў асобны раздзел. У працах Т. Владарчыка [22], В. Мысляка [23], М. Папаржыньскай-Турэк [24] і іншых разглядаюцца становішча праваслаўных беларусаў з Заходняй Беларусі і спроба іх «акаталічвання» з боку польскага касцёла. Па-другое, гэта даследаванні гісторыкаў Вілка С. [25], Мораза М. [26], Мруза М. [27],

прысвечаныя ўзаемаадносінам дзяржаўнай улады і касцёла ў ІІ Рэчы Паспалітай. Аўтары імкнуцца высветліць, ці спрыяла канфесійная палітыка інтэграцыйным працэсам на ўсходзе краіны, ці, наадварот, узмацняла сепаратызм беларусаў.

У канцы 1990-х – 2000-я гг. з'яўляюцца працы польскіх даследчыкаў, у якіх вывучаецца роля яўрэяў у сацыяльна-эканамічным развіцці ІІ Рэчы Паспалітай становіцца. Гэтая праблематыка з'яўляецца актуальным напрамкам даследаванняў для польскіх і польска-яўрэйскіх гісторыкаў у 2000-я – 2010-я гг. дзякуючы грантавай сістэме фінансавання гістарычнай навукі.

Значны ўнёсак у праблематыку вывучэння сацыяльна-эканамічнага становішча беларусаў у міжваеннай Польшчы быў зроблены ў першым перыядзе трэцяга этапа у польскай гістарыяграфіі заходнебеларускай праблематыкі дзякуючы абмеркаванню вышэйзгаданых праблем на старонках «Беларускіх гістарычных сшыткаў» (Беласток). Асобна неабходна ўзгадаць навуковую спадчыну Беларускага гістарычнага таварыства, прац вядомых гісторыкаў: Мірановіча Я. [28], Мілеўскага Я. Е. [7], Туронка Ю. [29], Латышонка А. [30], Сляшыньскага В. [20, 21], Смалярчыка Б. [17], Мораза М. [27], Тамчонка Е. [12], Чыквіна А. [18] і іншых., якія на працягу больш за два дзесяцігоддзі арганізоўваюць працу па правядзенні навукова-практычных мерапрыемстваў для вывучэння сацыяльна-эканамічных, этнаканфесійных і культурна-асветніцкіх аспектаў становішча беларусаў у міжваеннай Польшчы.

Між іншым, на нашу думку, грамадска-палітычнае і этнаканфесійнае жыццё беларускага насельніцтва ўсходніх ваяводстваў ІІ Рэчы Паспалітай, звязанае з палітыкай «паланізацыі» і «акаталічвання», а таксама абарона канстытуцыйных правоў насельніцтва мясцовымі прадстаўнікамі дэпутатаў Сейма, агітацыйна-прапагандысцкая дзейнасць палітычных партый, патрыятычная дзейнасць працоўных, сялянскіх і маладзёжных рухаў з'яўляюцца дамінуючымі тэмамі даследаванняў сярод польскіх гісторыкаў у ХХІ ст.

Неабходна адзначыць, што ў сучаснай польскай гістарыяграфіі правамерна вызначыць рэгіянальны кірунак вывучэння заходнебеларускага пытання гісторыкамі Беластоцкага ўніверсітэта і фарміравання польскай навуковай школы заходнебеларускай праблематыкі. У сваіх даследаваннях гісторыкі робяць акцэнт на вывучэнні сталінскіх рэпрэсій супраць жыхароў паўночна-ўсходніх паветаў Беластоцкага ваяводства (палякаў, беларусаў, яўрэяў) па класавай прыкмеце пасля аб'яднання з БССР. У даследаваннях П. Эберхарда [8], К. Гамулкі [2, 31], Я. Мірановіча [1, 28], М. Гнатоўскага [32], Я. Е. Мілеўскага [33], М. Вяржбіцкага [34], Ю. Туронка [29], А. Латышонка [30], А. Садоўскага [35], В. Сляшыньскага [20, 21] і іншых па пытаннях міжваеннай гісторыі Беларусі зроблена выснова, што Польшча, як і СССР, не мелі намеру задаволіць нацыянальныя памкненні беларусаў, а змагаліся супраць беларускага нацыяналізму.

**Вывады.** У якасці падсумавання магчыма падкрэсліць, что у пачатку ХХІ ст. польскія вучоныя вядуць плённую даследчыцкую працу па вывучэнні ўмоў фарміравання і накірунках развіцця польскай эканомікі з канстатацыяй таго, што паўночна-ўсходнія ваяводствы пасля далучэння да польскай рэспублікі знаходзіліся на дастаткова нізкім эканамічным развіцці ў параўнанні з заходнімі і цэнтральнымі ваяводствамі ІІ Рэчы Паспалітай. Адсюль, на думку польскіх даследчыкаў, незацікаўленаць польскага ўрада ў паспяховым развіцці сваіх усходніх ускраін. Такім чынам, палітыка польскага ўрада была не столькі эксплуататарскай, сколькі палітыкай уніфікацыі – гэта значыць палітыкай прыстасавання да асаблівасцей развіцця агульнапольскай эканомікі ўсіх яе рэгіянальных частак.

**Спіс літаратуры**

1. Мірановіч Яўген. Беларусы ў Польшчы (1918–1949). Вільня; Беласток: Інстытут беларусістыкі, Беларускае гістарычнае таварыства, 2010. 191 с.

2. Gomółka K. Polityka rządów polskich wobec mniejszości białoruskiej w latach 1918–1939 // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1995. N 2 (4). S. 106–120.

3. Tomaszewski J. Zarys dziejów żydów w Polsce w latach 1918–1939. Warszawa: Wyd-wa Uniwersytety Warszawskiego, 2001. 319 s.

4. Roczkowski W. Gospodarcza rola większej prywatnej własności ziemskiej w Polsce 1918–1939. Warszawa: PWN, 1989. 346 s.

5. Wapiński R. Pokolenia Drugiej Rzeczypospolitej. Warszawa: PWN, 1991. 412 s.

6. Wapiński R. Polska i małe ojczyzny Polaków: Z dziejów kształtowania się świadomości narodowej w XIX i XX wieku po wybuch II wojny światowej. Wrocław; Warszawa; Kraków, 1994. 420 s.

7. Milewski J. Z dziejów województwa Białostockiego w okresie międzywojennym. Białystok: Prymat, 1999. 137 s.

8. Eberhardt P. Przemiany narodowościowe na Białorusi. Warszawa: Editions Spotkania, 1994. 181 s.

9. Żarnowski J. Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolotej. Warszawa: PWN, 1973. 434 s.

10. Chojnowski A. Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939. Wrocław: Zakład Narodowy imienia Ossolińskich, 1979. 464 s.

11. Landau Z. Zarys historii gospodarczej Polski 1918–1939. Warszawa: Książka i wiedza, 1981. 327 s.
12. Tomczonek Z. Badania nad Kresami Północno-Wschodnimi Drugiej Rzeczypospolitej w polskiej historiografii // Historycy polscy, litewscy i białoruscy wobec problemów XX wieku: Historiografia polska, litewska i białoruska po 1989 roku. Białystok: Prymat, 2003. S. 16–26.
13. Czarnecki B. Rola historycznego rynku miejskiego we współczesnym funkcjonowaniu i strukturze małych miast Białostocczyzny // Małe Miasta: historia i współczesność: praca zbiorowa pod red. M. Zemło, P. Czyżewskiego. Supraśl: Współczesna Oficyna Supraska, 2001. S. 79–95.
14. Wierzbiniec W. Organizacja ziemiaństwa żydowskiego w II Rzeczypospolitej // Przegląd Historyczno Archiwalny. 2002. T. 11. S. 233–245.
15. Stobniak-Smogorzewska J. Kresowe osadnictwo wojskowe 1920–1945. Warszawa, RYTM, 2003. 420 s.
16. Kacprzek M. Towarzystwo rozwoju Ziem Wshodnich w latach 1933–1939. Lodź: Ibidem, 2005. 158 s.
17. Smolarczyk, A. Dzieje szkolnictwa na ziemiach północno-wschodnich Drugiej Rzeczypospolitej w historiografii polskiej i białoruskiej // Historycy polscy, litewscy i białoruscy wobec problemów XX wieku: Historiografia polska, litewska i białoruska po 1989 roku. Białystok: Prymat, 2003. S. 36–43.
18. Czykwin E. Białoruska mniejszność narodowa jako grupa stygnatyzowana. Białystok: Trans Humana, 2000. 248 s.
19. Żołędowski C. Białorusini i Litwini w Polsce, Polacy na Białorusi i Litwie: Uwarunkowania współczesnych stosunków między większością i mniejszościami narodowymi. Warszawa: ASPRA-JR, 2003. 360 s.
20. Śleszyński W. Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. Warszawa: Instytut Studiów Politycznych PAN, Oficyna Wydawnicza RYTM, 2007. 400 s.
21. Śleszyński W. Życie na Kresach. Województwa wschodnie II Rzeczypospolitej (1919-1939). Białystok: Muzeum Pamięci Sybiru, 2020. 362 s.
22. Włodarczyk T. Konkordaty: Zarys historii ze szczególnym uwzględnieniem XX w. Warszawa: PWN, 1986. 658.
23. Mysłek W. Przedmurze (Szkice z dziejów Kościoła Katolickiego w II Rzeczypospolitej). Warszawa: Wydawnictwo Spółdzielcze, 1987. 251 s.
24. Papierzyńska-Turek M. Między tradycją a rzeczewistością. Państwo wobec prawosławia 1918–1939. Warszawa: PWN, 1989. 481 s.
25. Wilk St. Episkopat Kościoła Katolickiego w Polsce w latach 1918–1939. Warszawa, 1992. 418 s.
26. Moroz M. «Krynica»: Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu. Białystok: Białoruskie Towarzystwo Historyczne, 2001. 230 s.
27. Mróz M. Katolicyzm na pograniczu: Kościół katolicki wobec kwestii ukraińskiej i białoruskiej w Polsce w latach 1918–1925. Toruń: Wyd-two Adam Marszałek, 2001. 311s.
28. Mironowicz E. Białoruska mniejszość narodowa w II Rzeczypospolitej w historiografii polskiej // Białoruskie Zeszyty Historyczne. 1995. N 2 (4). S. 176–180.
29. Turonek J. Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921–1939. Warszawa: Sławistyczny ośrodek wydawniczy, 2000. 80 s.
30. ŁatyszonekO. Białoruski ruch narodowy a protestantyzm w II Rzeczypospolitej // Społeczeństwo białorukie, litewskie i polskie na ziemach Połnocno-Wschodnich i Litwa Wschodnia w latach 1939–1941 (Materiały z konferencji naukowej, 24 – 26 listopada 1993, Warszawa). Warszawa: IPN, 1995. S. 33–40.
31. Gomółka K. Białorusini w Drugiej Rzeczypospolitej // Zeszyty Naukowe Politechniki Gdański ej. Ekonomia. Gdańsk, 1992. N 31. S. 168–182.
32. Gnatowski M. Polacy – Sowieci – Żydzi w regionie Łomżyńskim w latach 1939–1941: w 2 t. Łomża: Łomżyńskie towarzystwo naukowe im. Wagrów, 2005. T. 1. 256 s.
33. Milewski J. J. Władze i ugrupowania polityczne polskie wobec kwestii białoruskie w Polsce w okresie międzywojennym // Z dziejów Europy Srodkowo-Wschodniej. Białystok: Dział Wydaw. Filii UW, 1995. S. 361–371.
34. Wierzbicki M. Polacy i Białorusini w zaborze sowieckim. Stosunki polsko-białoruskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. 1939–1941. Warszawa: Fronda, 2007. 424 s.
35. Sadowski A. Narody wielkie i małe. Białorusini w Polsce. Krakow: Instytut Religioznawstwa UJ, 1991. 304 s.

## References

1. Mironovich Evgeny. *Belarusy u Pol'shchy (1918–1949)* [Belarusians in Poland (1918–1949)]. Vilnius, Bialystok, Instytut belarusistyki, Belaruskaye histarychnaye tavarystva Publ., 2010. 191 p. (In Belarusian).
2. Gomółka K. The policy of Polish governments towards the Belarusian minority in the years 1918–1939. *Białoruskie Zeszyty Historyczne* [Belarusian Historical Journal], 1995, no 2 (4), pp. 106–120 (In Polish).

3. Tomaszewski J. *Zarys dziejów żydów w Polsce w latach 1918–1939* [An outline of the history of Jews in Poland in the years 1918–1939]. Warsaw, Wyd-wa Uniwersytety Warszawskiego Publ., 2001. 319 p. (In Polish).

4. Roczkowski W. *Gospodarcza rola większej prywatnej własności ziemskiej w Polsce 1918–1939* [The economic role of larger private landed property in Poland, 1918–1939]. Warsaw, PWN Publ., 1989. 346 p. (In Polish).

5. Wapiński R. *Pokolenia Drugiej Rzeczypospolitej* [Generations of the of the Second Polish Republic]. Warsaw, PWN Publ., 1991. 412 p. (In Polish).

6. Wapiński R. *Polska i małe ojczyzny Polaków: Z dziejów kształtowania się świadomości narodowej w XIX i XX wieku po wybuch II wojny światowej* [Poland and the small homelands of Polands: From the history of the formation of national consciousness in the 19th and 20th centuries to the outbreak of World War II]. Wroclaw; Warsaw; Krakow, 1994. 420 p. (In Polish).

7. Milewski J. *Z dziejów województwa Białostockiego w okresie międzywojennym* [From the history of the Białystok Voivodship in the interwar period]. Bialystok, Prymat Publ., 1999. 137 p. (In Polish).

8. Eberhardt P. *Przemiany narodowościowe na Białorusi* [National changes in Belarus]. Warsaw, Editions Spotkania Publ., 1994. 181 p. (In Polish).

9. Żarnowski J. *Społeczeństwo Drugiej Rzeczypospolotej* [The society of the Second Polish Republic]. Warsaw, PWN Publ., 1973. 434 p. (In Polish).

10. Chojnowski A. *Koncepcje polityki narodowościowej rządów polskich w latach 1921–1939.* [Concepts of nationality policy of Polish governments in the years 1921–1939]. Wroclaw, Zakład Narodowy imienia Ossolińskich Publ., 1979. 464 p. (In Polish).

11. Landau Z. *Zarys historii gospodarczej Polski 1918–1939* [An outline of Poland's economic history 1918–1939]. Warsaw, Książka i wiedza Publ., 1981. 327 p. (In Polish).

12. Tomczonek Z. Research on the North-Eastern Borderlands of the Second Polish Republic in Polish historiography. *Historycy polscy, litewscy i białoruscy wobec problemów XX wieku: Historiografia polska, litewska i białoruska po 1989 roku* [History of education in the north-eastern lands of the Second Republic in Polish and Belarusian historiography to 1989]. Bialystok, Prymat Publ., 2003, pp. 16–26 (In Polish).

13. Czarnecki B. The role of the historic town square in the contemporary functioning and structure of small towns in the Bialystok region. *Małe Miasta: historia i współczesność: praca zbiorowa pod red. M. Zemło, P. Czyżewskiego.* Suprasl, Współczesna Oficyna Supraska Publ., 2001, pp. 79–95 (In Polish).

14. Wierzbiniec W. The organization of the Jewish landed gentry in the Second Polish Republic. *Przegląd Historyczno Archiwalny*, 2002, vol. 11. pp. 233–245 (In Polish).

15. Stobniak-Smogorzewska J. *Kresowe osadnictwo wojskowe 1920–1945* [Borderland military settlement 1920–1945]. Warsaw, RYT Publ., 2003. 420 p. (In Polish).

16. Kacprzek M. *Towarzystwo rozwoju Ziem Wshodnich w latach 1933–1939* [Society for the Development of the Eastern Territories in 1933–1939]. Lodz, 2005. 158 p. (In Polish).

17. Smolarczyk A. History of education in the north-eastern lands of the Second Republic in Polish and Belarusian historiography. *Historycy polscy, litewscy i białoruscy wobec problemów XX wieku: Historiografia polska, litewska i białoruska po 1989 roku* [History of education in the north-eastern lands of the Second Republic in Polish and Belarusian historiography to 1989]. Bialystok, Prymat Publ., 2003. pp. 36–43. (In Polish).

18. Czykwin E. *Białoruska mniejszność narodowa jako grupa stygnatyzowana* [The Belarusian national minority as a stigmatized group]. Bialystok, Trans Humana Publ., 2000. 248 p. (In Polish).

19. Żołędowski C. *Białorusini i Litwini w Polsce, Polacy na Białorusi i Litwie: Uwarunkowania współczesnych stosunków między większością i mniejszościami narodowymi* [Belarusians and Lithuanians in Poland, Poles in Belarus and Lithuania: conditions of contemporary relations between the majority and national minorities]. Warsaw, ASPRA-JR Publ., 2003. 360 p. (In Polish).

20. Śleszyński W. *Bezpieczeństwo wewnętrzne w polityce państwa polskiego na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej* [Internal security in the policy of the Polish state in the north-eastern territories of the Second Polish Republic]. Warsaw, Instytut Studiów Politycznych PAN, RYTM Publ., 2007. 400 p. (In Polish).

21. Śleszyński W. *Życie na Kresach. Województwa wschodnie II Rzeczypospolitej (1919–1939*) [Life on Kresy. Eastern voivodeships of the Second Polish Republic (1919–1939)]. Bilystok: Muzeum Pamięci Sybiru Publ., 2020. 427 p. (In Polish).

22. Włodarczyk T. *Konkordaty: Zarys historii ze szczególnym uwzględnieniem XX wieku* [Concordats: Outline of history with particular emphasis on the 20th century]. Warsaw, PWN Publ., 1986. 658 p. (In Polish).

23. Mysłek W. *Przedmurze (Szkice z dziejów Kościoła Katolickiego w II Rzeczypospolitej)* [Przedmurze (Sketches from the history of the Catholic Church in the Second Polish Republic)]. Warsaw, Wydawnictwo Spółdzielcze Publ., 1987. 251 p. (In Polish).

24. Papierzyńska-Turek M. *Między tradycją a rzeczewistością* [Between tradition and reality]. Warsaw, PWN Publ., 1989. 481 p. (In Polish).

25. Wilk St. *Episkopat Kościoła Katolickiego w Polsce w latach 1918–1939* [The Episcopate of the Catholic Church in Poland in the years 1918–1939]. Warsaw, 1992. 418 p. (In Polish).

26. Moroz M. *"Krynica": Ideologia i przywódcy białoruskiego katolicyzmu* ["Krynica": Ideology and leaders of Belarusian Catholicism]. Bialystok, Białoruskie Towarzystwo Historyczne Publ., 2001. 230 p. (In Polish).

27. Mróz M. *Katolicyzm na pograniczu: Kościół katolicki wobec kwestii ukraińskiej i białoruskiej w Polsce w latach 1918–1925* [Catholicism on the border: the Catholic Church in the face of the Ukrainian and Belarusian question in Poland, 1918–1925]. Torun, Adam Marszałek Publ., 2001. 311p. (In Polish).

28. Mironowicz E. The Belarusian national minority in the Second Republic in Polish historiography. *Białoruskie Zeszyty Historyczne* [Bielorusian Historical Book], 1995, no 2 (4), pp. 176–180 (In Polish).

29. Turonek J. *Książka białoruska w II Rzeczypospolitej 1921–1939* [Book of Belarus in the second Polish Republic 1921–1939]. Warsaw, Sławistyczny ośrodek wydawniczy Publ., 2000. 80 p. (In Polish).

30. Latyshonek O. The Belarusian national movement and Protestantism in the Second Polish Republic Rzhechpospolita. S*połeczeństwo białorukie, litewskie i polskie na ziemach Połnocno-Wschodnich i Litwa Wschodnia w latach 1939–1941* [Society of Belarus, Lithuania and Poland in the north-eastern lands and Eastern Lithuania in the years 1939–1941]. Warsaw, WPN Publ., 1995, pp. 33–40 (In Polish).

31. Gomółka K. Belarusians in the Second Republic. *Zeszyty Naukowe Politechniki Gdańskiej. Ekonomia*. Publ., Gdańsk, 1992, no 31, pp. 168–182 (In Polish).

32. Gnatowski M. *Polacy – Sowieci – Żydzi w regionie Łomżyńskim w latach 1939–1941*: w 2 t. [Poles-Soviets – Jews in the Łomża region in the years 1939–1941: in 2 vol.]. Lomza, Łomzynskie towarzystwo naukowe im. Wagrow Publ., 2005, vol. 1. 256 p. (In Polish).

33. Milewski J. J. Polish authorities and political groups in relation to the Belarusian question in Poland in the interwar period. *Z dziejów Europy Srodkowo-Wschodniej*. Bialystok, Dział Wydaw. Filii UW Publ., 1995, pp. 361–371 (In Polish).

34. Wierzbicki M. *Polacy i Białorusini w zaborze sowieckim. Stosunki polsko-białoruskie na ziemiach północno-wschodnich II Rzeczypospolitej. 1939–1941* [Poles and Belarusians in the Soviet Union. Polish-Belarusian relations in the north-eastern lands of the Second Republic. 1939–1941]. Warsaw, Fronda Publ., 2007. 424 p. (In Polish).

35. Sadowski A. *Narody wielkie i małe. Białorusini w Polsce* [Nations great and small. Belarusians in Poland]. Krakow, Instytut Religioznawstwa UJ Publ., 1991. 304 p. (In Polish).

## Інфармацыя пра аўтара

**Дрожжа Людміла Чэславаўна** – магістр гісторыі, старшы навуковы супрацоўнік дзяржаунай установы «Беларускі навукова-даследчы цэнтр электроннай дакументацыі» Дэпартамента па архівах і справаводству Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь (220084, г. Мінск, вул. Ф. Скарыны, 51, корп. 2, Рэспубліка Беларусь). E-mail: l_drojja@tut.by

## Information about the author

**Drozhzha Liudmila Cheslsvauna** – Master of History, Senior Researcher at the Belarusian Research Center for Electronic Documentation of the Department for Archives and Records Management of the Ministry of Justice of the Republic of Belarus (51/2 F. Skorina str., 220084, Minsk, Republic of Belarus). E-mail: l_drojja@tut.by

*Пастуніў 12.02.2023*